этапная (и в жизни поэта, и в истории национальной поэзии), “открытая” и “закрытая” (завершенно-незавершенная), отвечает типам авторской книги и редакторского избранного, типам “стихотворения поэмы” и “стихи и переводы”, по типу контекстовых форм лирики это и макроструктура, и метаобразование” [4, с. 80].

Думаецца, сучаснае літаратуразнаўства пашырыць корпус навуковых даследаванняў творчасці выбітнага класіка нацыянальнай літаратуры – М. Багдановіча.

Літаратура

1. Васючэнка, П.В. Славянкі сімвалізм : нацыянальна-адметнае і агульнае / Пятро Васючэнка. — Мінск : Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт, 1998. – 18 с.

2. Васючэнка, П.В. Беларуская літаратура ХХ стагоддзя і сімвалізм / П.В. Васючэнка ; навук. рэд. В.П. Жураўлёў. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : МДЛУ, 2016. – 200 с.

3. Верына, У. Алег Лойка – укладальнік “Маладзіка” Максіма Багдановіча / Ульяна Верына // Роднае слова. – 2016. – № 5. – С. 20 – 22.

4. Книга стихов как феномен культуры России и Беларуси: монография / Н. В. Барковская [и др.]. – Москва : Екатеринбург : Кабинетный ученый, 2016. — 673 с.

5. Лойка, А.А. Максім Багдановіч / Алег Лойка. – Мінск : Навука і тэхніка, 1966. – 333 с.

6. Лойка, А.А. Беларуская паэзія пачатку ХХ стагоддзя. Некаторыя заканамернасці і асаблівасці. / А. Лойка – Мінск : Выд-ва БДУ, 1972. — 240 с.

Г.А. Гладкова (Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава)

РАМАНТЫЗАЦЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ГІСТОРЫІ Ў РАМАНЕ Л. ДАЙНЕКІ “ПРА ЛІСОЎЧЫКА, ЗЛОГА ХЛОПЧЫКА”

Ключавыя словы: лісоўчыкі, раман, стыль, гістарычная проза, Смутны час, Рэч Паспалітая, Масковія.

Творчасць Л. Дайнекі – яскравая старонка сучаснай нацыянальнай літаратуры. Працуючы ў розных жанрах, пісьменнік заставаўся аматарам беларускай гісторыі, эпізоды з якой станавіліся сюжэтнай асновай шэрагу раманаў (“Меч князя Вячкі”, “След ваўкалака”, “Жалезныя жалуды” і інш.).

Гістарычны раман Л. Дайнекі “Пра лісоўчыка, злога хлопчыка” (2010) стаў пісьменніцкай спробай паказаць непарыўную сувязь гістарычных рэалій беларускай сучаснасці і эпохі Смутнага часу, выбітнай асобай якога быў палкоўнік Аляксандр Лісоўскі. Мэта – на матэрыяле гістарычнага рамана Л. Дайнекі “Пра лісоўчыка, злога хлопчыка” вылучыць адметнасці аўтарскай інтэрпрэтацыі нацыянальнай гісторыі.

У айчынным літаратуразнаўстве згаданы твор яшчэ маладаследаваны. Так, спробу аналізу гістарычнага фона рамана

ажыццявіла Т. Лаўрык [4]. Даследчыца звярнула ўвагу на аўтарскае адлюстраванне асобы палкоўніка А. Лісоўскага і дзейнасці яго атрадаў у Масковіі XVII стагоддзя, спынілася на гістарычных эпізодах, якія ляглі ў сюжэтную аснову твора.

Адметнасцю кампазіцыі рамана стала перакрыжаванне мастацкага выкладу падзей сучаснасці і мінулага, пры гэтым аўтар стварае ў чытача ўяўленне пра вечны колазварот гісторыі: наступныя пакаленні паўтараюць сваіх продкаў, адчуваюць шчыльную злучанасць з імі, трапляюць у аналагічныя сітуацыі, але робяць гэта ў новых гістарычных абставінах.

Назву рамана пісьменнік тлумачыць у эпіграфе, які ўяўляе сабой фрагмент песні: *“Мы – лісоўчыкі, злыя хлопчыкі, / З цара-бацькі здзярэм панталончыкі”* [1, с. 15]. Як далей пазначае Л. Дайнека, лісоўчыкамі называлі сябе ваяры з непераможнай лёгкай кавалерыі, якой кіраваў славуты віленскі пан палкоўнік Аляксандр Язэп Лісоўскі.

Часавая прастора рамана прадстаўлена спалучэннем сучасных падзей (сусветны фінансавы крызіс пачатку XXI ст.) і эпохі XVII стагоддзя (т. зв. Смутны час). Такая паралель абіраецца невыпадкова: і героям-сучаснікам, і іх далёкім продкам прыходзілася жыць у выпрабавальны гістарычны момант.

Героямі твора сталі індывідуальны прадпрымальнік Вітаўт Гарткевіч, яго аднакурснік па вайсковай вучэльні Іван Мастоўскі, пісьменнік Антон Даніловіч-Гоцкі і кандыдат гістарычных навук Аляксандр Іосіфавіч Лісоўскі, патомны беларускі граф, прамы нашчадак у шаснаццатым калене віленскага шляхціча палкоўніка Аляксандра Лісоўскага. Сустрэчу герояў аўтар падсумаваў наступным чынам: *“Падсвядома яны адчувалі невыпадковасць, наканаванасць сваёй сустрэчы. Іхнія лёсы, іхнія жыццёвыя дарогі павінны былі зліцца ў адно цэлае. Але дзеля чаго?”* [1, с. 45].

Прыгодніцкі элемент рамана звязаны не толькі з падзеямі, але і самапачуваннем герояў, якое перададзена праз алюзію да вядомага твора А. Дзюма “Тры мушкецёры”: *“ – Я ведаю, Антон, што ты пішаш раман «Тры лісоўчыкі», – сказаў Мастоўскі. – Цябе, як я разумею і як ты сам прызнаваўся, натхніў Аляксандр Дзюма і ягоныя «Тры мушкецёры». […] Ты, вядома ж, напішаш свой раман. Добры і патрэбны ўсім нам. А пакуль што – будзь нашым д’Артаньянам! […] Ты ж, Лявон – Атос. Ты, Вітаўт – Араміс. А я (тут Іван Мастоўскі крыху сумеўся і пачырванеў) – Партос*” [1, с. 48–49]. Герояў не задавальняе іх “сённяшняе прымітыўнае быццё-існаванне”, “у гэтым сонным жыцці-балоце” ім хацелася незвычайных прыгодаў, бо дзякуючы ім чалавек можа пражыць не адно жыццё, а некалькі. Невыпадкова пісьменнік Даніловіч-Горскі працуе над раманам “Тры лісоўчыкі”, канчаткова вызначыўшы, што гэта будзе беларускі рамантычна-містычна-гістарычны баявік: *“Трэба даць чытачу, асабліва маладому, кніжку, якая вучыць адвазе, вернасці і гордасці за свой край, свой народ”* [1, с. 52].

Рамантызацыя вобразаў герояў-прадстаўнікоў XXI стагоддзя паказальная ў словах А. Лісоўскага, вялікага аматара беларускай гістарычнай прозы, які называе Вітаўта, Івана і Антона “сапраўднымі лісоўчыкамі”, здольнымі абараніць свой гонар у любой сітуацыі. Такім чынам, назіраецца пашырэнне паняцця “лісоўчык”: акрэсленае рамкамі гістарычнага кантэксту слова набывае больш пашыранае, другаснае значэнне “надзейны сябар, мужны абаронца гонару, носьбіт высакародных якасцей”.

Падзеі XXI стагоддзя саступаюць месца апісанню гістарычнага мінулага, у якім дзейнічаюць героі-носьбіты тых жа імёнаў, таго ж узросту і ўласцівасцей характару. З пэўнай доляй рамантызацыі створаны партрэт шляхціча Аляксандра Лісоўскага: *“Высокі, з доўгімі светлымі валасамі, што хваляю апускаліся на шырокія плечы, з цёмнымі бровамі і вусамі, з сінім агнём вялікіх заўсёды адважных вачэй, Лісоўскі хадзіў па зямлі і ўзлётваў у баявое сядло з нейкай крылатай лёгкасцю, быццам нябачныя стороннім людзям анёлы падхоплівалі яго. Здавалася, без ніякіх высілкаў ён мог цэлы дзень імчацца на кані альбо ісці пешшу па пяску і па балоту. Амаль не было яму роўні і ў шабельнай сечы, і ў стральбе з рушніцы, пісталета і лука. Вядома, давалася ўсё гэта няспыннымі цяжкімі трэніроўкамі, працаю да сёмага поту”* [1, с. 13–14]. Л. Дайнека дакладна распавёў пра сталенне героя, які, здавалася, быў здатны на ўчынкі, што былі не па сіле звычайнаму чалавеку.

Разумны і таленавіты кіраўнік, Лісоўскі забірае ў свой почат Вітаўта Гарткевіча і яго каханую Эльвіру Скаблінскую. Тая дэталь, што дзяўчына становіцца вершнікам-ваяром і спадарожнікам у вайсковых справах, яднае нацыянальную гісторыю са старажытнай сармацкай і нават заходнееўрапейскай: “*Чым мы, ліцвіны, горшыя за французаў альбо грэкаў? Чаму між нашага народу не можа быць сваёй Жанны д’Арк і сваёй амазонкі?*” [2, с. 63].

З вайсковых спраў А. Лісоўскага ў рамане ўзгаданыя паходы ў Інфлянты і Масковію, ёсць паведамленне пра рэйды за Урал. Пры гэтым, пісьменнік абгрунтоўвае прычыны паходаў, падрабязна апісвае абставіны, робіць гістарычны аповед па-мастацку аздобленым.

На старонках рамана акрамя герояў, створаных аўтарскай фантазіяй, дзейнічаюць рэальныя гістарычныя асобы: канцлер Леў Сапега, уладальнік Нясвіжа магнат Мікалай Крыштаф Радзівіл “Сіротка”, гетман Януш Патоцкі і інш. Л. Дайнека, распрацоўваючы мастацкія характары герояў, імкнецца не толькі захаваць гістарычную дакладнасць, але і зрабіць вобраз захапляльным для чытача.

Ідэйным цэнтрам твора стаў дыялог пана Лісоўскага з канцлерам Сапегам пра лёс народа, яго складанае становішча паміж больш моцнымі суседзямі, ваганні, спрадвечны пошук ісціны. Падсумоўваючы развагі, Леў Сапега тлумачыць: “*Вось чаму ў віленскай друкарні Мамонічаў я фінансаваў і распарадзіўся надрукаваць Статут Вялікага Княства*

Літоўскага нашай прыроднай моваю, каб паказаць усім і кожнаму, хто мы ёсць на гэтай зямлі” [2, с. 68].

Ваенныя подзвігі лісоўчыкаў відавочныя з паведамлення пра страты ў Інфлянтах: у войску гетмана Хадкевіча загінула некалькі соцень ваяроў, з якіх адзінаццаць – лісоўчыкі, пры гэтым страта шведаў – некалькі тысяч забітых. Відавочна, што гэта была бліскучая перамога польскай і літвінскай зброі пры тым, што атрады лісоўчыкаў уступалі ў бой з рэйтарамі, прафесійнымі шведскімі ваярамі, і хоць не хапала літвінам баявога майстэрства, але, як адзначае аўтар, “адвагі ім было не пазычаць”.

Як вядома, за перамогу ў бітве пад Кірхольмам А. Лісоўскі атрымаў ад Жыгімонта III Вазы чын каралеўскага палкоўніка.

У атрадах Лісоўскага, якія, дарэчы, амаль не мелі абозаў, а былі лёгкай кавалерыяй, панавала жорсткая дысцыпліна, асновай тактыкі стаў маланкавы напад на ворага, хуткасць і жорсткасць у бітве. Невыпадкова на памежных землях лісоўчыкаў баяліся і называлі вершнікамі Апакаліпсісу. Палкоўнік Лісоўскі часта параўноўваўся з драпежнікам, ваўком, у рамане самахарактарыстка героя гучыць наступным чынам: “*...той, хто пойдзе са мною, хто дабраахвотна ўзваліць на сябе гэты крыж, ведай: я не дарую слабасці і палахлівасці, не спушчу гультаю і дармаеду. Рымскія мудрацы калісьці навучалі: «Lupus non mordet lupum» – Воўк не кусае ваўка. Няпраўда. Я, Аляксандр Лісоўскі, воўк, і я ўкушу, прытым укушу вельмі балюча кожнага з вас, маіх ваўкоў, хто асмеліцца не паслухацца мяне і не падпарадкавацца мне*” [3, с. 20].

Заключаная частка рамана ўяўляе сабой аповед пра рэйды палкоўніка ў Масковію. Таленавіты стратэг, Лісоўскі часта мяняў тактыку нападаў: абмінаў гарады, “прабіраўся ценем”, з’яўляўся там, дзе яго ніяк не чакалі. Апошні эпізод, звязаны з імем Лісоўскага ў рамане, – гэта аблога Троіца-Сергіевай лаўры, дзе знаходзіліся каштоўнасці, вывезеныя падчас Лівонскай вайны з полацкай Сафіі. Спроба іх вяртання стала яшчэ адной мэтай славутага ваяра.

Прарочымі аказаліся словы А. Лісоўскага адносна будучыні: “*Думаю, гадоў праз пяцьсот з Божай дапамогаю ўваскрэснем усе мы, паны-брацці, на сваёй роднай зямлі. На зямлі, якую любілі, якую баранілі ад ворага. Хацелася б ведаць, хто і што сустрэне нас тады, якімі вачыма будуць глядзець на нас тадышнія людзі*” [3, с. 62–63].

Н.В. Хаменка слушна заўважае, што для Л. Дайнекі гісторыя – гэта “ключ да разумення жыцця сучаснай Беларусі” [5, с. 235]. Гэты тэзіс выдатна ілюструе гістарычны раман “Пра лісоўчыка, злога хлопчыка”, які стаў арыгінальнай спробай пісьменніка аднавіць нацыянальную гісторыю, па-мастацку аздобіць яе і зрабіць падмуркам для самаідэнтыфікацыі беларусаў у XXI стагоддзі.

Думаецца, паўнавартасны аналіз гістарычнай прозы Л. Дайнекі атрымае далейшую распрацоўку ў айчынным літаратуразнаўстве і будзе

спрыяць пашырэнню чытацкай зацікаўленасці якаснай сучаснай гістарычнай літаратурай.

Літаратура

1. Дайнека, Л. Пра лісоўчыка, злога хлопчыка / Л.Дайнека // Дзеяслоў. – 2010. – № 1. – С. 15–109.

2. Дайнека, Л. Пра лісоўчыка, злога хлопчыка / Л.Дайнека // Дзеяслоў. – 2010. – № 2. – С. 13–104.

3. Дайнека, Л. Пра лісоўчыка, злога хлопчыка / Л.Дайнека // Дзеяслоў. – 2010. – № № 3. – С. 13–102.

4. Лаўрык, Т. Адлюстраванне эпохі праўлення Жыгімонта II Вазы ў рамане Л.Дайнекі "Пра лісоўчыка, злога хлопчыка" / Т.Лаўрык // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі. Да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча : зб. арт. па матэрыялах міжнар. навук. канф. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: І. Э. Багдановіч (гал. рэд.) [і інш.] ; пад рэд. І. Э. Багдановіч, М. І. Свістуновай. – Мінск : БДУ, 2018. – С. 364–373.

5. Хаменка, Н. В. Постаці беларускай гісторыі ў творах Л. Дайнекі / Н. В. Хаменка // Слово. Текст. Социум : сборник научных трудов / Министерство образования Республики Беларусь, Учреждение образования «Мозырский государственный педагогический университет имени И. П. Шамякина» ; [редколлегия: Л. В. Исмайлова (ответственный редактор) и др.]. – Мозырь : МГПУ им. И. П. Шамякина, 2014. – С. 234–236.

А.А. Дзенісевіч (ДУА "Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва")

АЛЕСЬ РАЗАНАЎ І ЯГО ЖАНРАВЫЯ "РЭФОРМЫ" Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ

Ключавыя словы: жанр, літаратурная гульня, балада, паэма, проза.

Алесь Разанаў – яркі наватар, нястомны стваральнік новых слоў і жанравых форм у сучаснай беларускай паэзіі. Творчасць паэта засяродзіла на сабе ўвагу, пасля з'яўлення першага, прызнанага крытыкамі і чытачамі, зборніка. Дзяржаўную прэмію імя Янкі Купалы Алесь Разанаў атрымаў у 1990 годзе за кнігу "Вастрыё стралы" (1988). 20 моў свету змяшчаюць у сабе пераклады твораў паэта. Калі пісьменнік – асабліва сучасны пісьменнік – выбірае сабе жанр, ён не столькі імкнецца прытрымлівацца яго вечным законам і патрабаванням, колькі робіць яго прадметам літаратурнай гульні. Літаратурная гульня не заўсёды ляжыць у аснове ўзнікнення новых жанравых рэформ. Выбар паэзіі А. Разанава абумоўлены перш за ўсё тым, што творчасць гэтага паэта мае жанравую разнастайнасць і маладаследавана ў галіне літаратуразнаўства.

Алесь Разанаў увайшоў у беларускую літаратуру ў 70-х гадах XX стагоддзя дзвюма першымі кнігамі "Адраджэнне" (1970) і "Назаўжды" (1974).

Зборнік "Адраджэнне" (1970) быў выпраўлены, таму некаторыя творы змяніліся. Сама назва зборніка, "Адрачэнне", была перабудавана на